## ▪ Кніжны навігатар

# Новы твор вядомага земляка




### Андрэй ФЕДАРЭНКА і яго "Жэтон на метро"

У выдавецтве "Мастацкая літаратура" выйшла кніга аднаго з лепшых беларускіх сучасных празаікаў Андрэя Федарэнка, аўтара вядомых кніг "Афганская шкатулка", "Шчарбаты талер" (паводле якога на "Беларусьфільме" зняты тэлевізійны міні-серыял), "Нічые", "Мяжа", "Смута" і інш.

Адметна тое, что Андрэй Федарэнка – наш зямляк, ён нарадзіўся ў вёсцы Бярозаўка Мазырскага раёна. Некаторы час працаваў бібліятэкарам Бярозаўскай сельскай бібліятэкі.

Яго новы раман "Жэтон на метро" пабудаваны па законах трылера. Твор пачынаецца з трывожнага званка гарадскога тэлефона, па якім ужо даўно ніхто не турбуе галоўнага героя, паэта Віктара Рака...

Гэты тэлефонны званок нібыта запускае шэраг падзей, як гадзіннікавы механізм, шасцерні ў якім пачынаюць рухацца. Далей у жыццё Віктара ўваходзіць мноства незвычайных персанажаў, а сюжэт раскручваецца ўсё больш і больш.

Пісьменнік не шкадуе сіл, каб стварыць рэалістычныя і цалкам псіхалагічна абгрунтаваныя партрэты сваіх герояў, якія, як ужо разумее чытач, звязаныя жудаснай таямніцай.

Усе гэтыя людзі ў нейкі момант акружаюць галоўнага героя, а потым нечакана знікаюць, пакідаючы яго ў здзіўленні: а што гэта было і навошта ён ім спатрэбіўся? Увогуле, інтрыга нарастае з кожнай старонкай.

Аўтар выдатна распрацаваў сюжэт і перапляценні лёсаў герояў, кніга паступова павольна рухаецца і чытач бачыць, як разрознены пазл складаецца ў цэлае палатно.

Кнігу можна набыць ва ўсіх бібліятэках горада (акрамя дзіцячай) і аграгарадках Каменка, Козенкі, Махнавічы і Слабада.

**Людміла КІР'ЯНАВА.**